насць журналістаў ажыццяўляецца цалкам «зверху», пры пасіўным чаканні чытацкай аўдыторыі. Журналісцкі калектыў павінен уздзейнічаць на грамадскую свядомасць з улікам сацыяльных асаблівасцей і інфармацыйных інтарэсаў чытачоў свайго рэгіёна. І пры фарміраванні газетнай праблематыкі кіраўніцкага характару зваротная сувязь адыгрывае значную ролю.

Яшчэ большае значэнне зваротная сувязь набывае пры фарміраванні другой асноўнай плыні газетнай праблематыкі — той, якая адлюстроўвае непасрэдна чытацкія інтарэсы, прамы заказ чытачоў. Яе асяродкам з'яўляецца тэматыка, звязаная з асабістымі патрэбамі асобы, бытам, сямейным жыццём, аховай здароўя і да т. п., а таксама з задавальненнем імкнення людзей зведаць нешта незвычайнае (здарэнні, цікавыя знаходкі, анамальныя з'явы).

Арганічнае знітаванне дзвюх тэматычных плыняў (кіраўніцкай і «заказной») абумоўлівае жыццядзейнасць друкаванага органа, эфектыўнасць і дзейснасць яго функцыяніравання, масавасць і папулярнасць у чытачоў.

Такім чынам, інтэнсіфакацыю функцыяніравання раённага друку, вывад яго на ўзровень, які адпавядаў бы акрэсленай на сённяшні дзень мадэлі палітычнай сістэмы, трэба пачынаць з распрацоўкі грунтоўнай канцэпцыі мясцовых выданняў. Аснова гэтай канцэпцыі наступная: 1. Адзін выдавец (мясцовы Савет народных дэпутатаў). 2. У адпаведнасці з дзяржаўным статусам выдаўца вызначаецца прыярытэтная праблематыка (інфармацыя і прапаганда «зверху»). 3. Наладжваецца сацыялагічнае вывучэнне аўдыторыі кожнага рэгіёна, распрацоўваецца сістэма зваротнай сувязі, якая дазваляе фарміраваць і аператыўна мяняць праблематыку з улікам волі чытачоў.

*А. Г. СЛУКА*

## СУЧАСНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ДЗЕЙНАСЦІ СМІ І НЕАБХОДНАСЦЬ УДАСКАНАЛЬВАННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ЖУРНАЛІСТАЎ

Аўтарытэт сродкаў масавай інфармацыі ў цяперашні час дасягнуў такой вышыні, што можна сказаць: перыяд упадку прэстыжу журналісцкай прафесіі мы перажылі.

Публіцыстыка бударажыць грамадскую свядомасць. Яна стала адной з самых моцных форм галоснасці. Узрастае і эфектыўнасць беларускіх СМІ. Значна змястоўней сталі адлюстроўваць вострыя грані перабудовы «Звязда», «Сельская газета», «Знамя юности», «Чырвоная змена», многія часопісы, рэспубліканскае радыё і тэлебачанне.

Але пры ўважлівым аналізе дзейнасці рэспубліканскіх СМІ бачны гэтакі парадокс: майстэрства журналістаў як бы адстае ад разнастайнасці жыцця. Не праяўляецца яркіх талентаў у даследаванні спецыфікі беларускай эканомікі, палітычных, навуковых і культурных праблем, асабліва такога хвалюючага ўсіх пытання, як захаванне і развіццё роднай мовы.

Ва ўсім гэтым я бачу неабходнасць перабудовы існуючай сістэмы падрыхтоўкі кадраў журналістаў у ВНУ.

Калі пачыналася рэформа вышэйшай адукацыі, вучоны Савет факультэта на аснове арганічнага спалучэння тэорыі і практыкі навучання і выхавання студэнтаў зацвердзіў новы вучэбны план. Быў скарочаны перагружаны звыш усякай меры рабочы тыдзень студэнта, скасаваны ўстарэлыя дысцыпліны, уведзены новыя курсы і спецкурсы, дзень практычных заняткаў у рэдакцыях і г. д. Зменены стыль навучання. У зносінах студэнтаў і выкладчыкаў з'явіліся прамежныя залікі, індывідуальныя кансультацыі, гутаркі. Студэнты-выдатнікі атрымалі магчымасць займацца па індывідуальнаму плану, датэрмінова здаваць экзамены і г. д. Новы вучэбны план быў заснаваны такім чынам, каб студэнты разам з выкладчыкамі інтэнсіўна здабывалі і прымнажалі веды, а пад кіраўніцтвам журналістаў у рэдакцыях авалодвалі асновамі будучай прафесіі.

Здавалася, што была знойдзена аптымальная мадэль вучобы журналістаў, тым больш, што новы план па асноўных кірунках зближаны з міжнародным узорам. Аднак жыццё паказала, што адной рэканструкцыі навучальнага працэсу далёка недастаткова для вырашэння гэтай складанай ідэалагічнай праблемы ва ўмовах абнаўлення сацыялізма. Для гэтага патрэбна сучасная канцэпцыя падрыхтоўкі і выкарыстання нацыянальных журналісцкіх кадраў, якой раней не існавалаа ні ў адной саюзнай рэспубліцы.

Станаўленне сістэмы журналісцкай адукацыі ў нашай краіне адбывалася цэнтралізавана, на аснове тыповых вучэбных планаў былога Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР. Гэта дазволіла даволі хутка стварыць факультэты і аддзяленні пры універсітэтах і таксама аператыўна папоўніць рэдакцыі спецыялістамі рознага профілю. Масавая падрыхтоўка журналістаў дала выдатны вынік: на 51 % забяспечаны дыпламіраванымі кадрамі рэдакцыі СМІ рэспублікі. Аднак у час перабудовы колькасць уступіла ў жорсткую супярэчнасць з якасцю, старыя вучэбныя праграмы — з абноўленай сутнасцю сучасных СМІ.

Выявілася аднабаковасць сістэмы вытворчасці кадраў, нівеліраванне ў ёй нацыянальных традыцый, асаблівасцей эканомікі, палітычнага і культурнага жыцця рэспублік і рэгіёнаў нашай краіны.

У вучэбным плане не было, ды і зараз яшчэ няма дысцыплін па вывучэнню нацыянальнай грамадска-палітычнай думкі. Пагэтаму з свядомасці студэнтаў выпадалі пласты развіцця нацыі, дыялектыкі гістарычнага працэсу.

Такім чынам, у самой аснове журналісцкай адукацыі адсутнічаў тэарэтычна абгрунтаваны нацыянальны прынцып. Ён быў заменены безаблічнай арыентацыяй на выхаванне журналіста ўвогуле. У плане нават адсутнічала слова «нацыянальны», у дужках было ўказана «дысцыпліны, уводзімыя ў сувязі са спецыфікай рэспублікі». Безумоўна, справа не ў словах. Аднак відавочны факт, што на факультэтах журналістыкі ў рэспубліках слаба вывучалі гісторыю сваіх народаў і гісторыю нацыянальнага друку, багацце літаратуры і мастацтва.

Гэта мела далёка ідучыя негатыўныя вынікі. Нацыянальны змест у сродках масавай інфармацыі паступова сышоў са сваіх пазіцый і ўступіў агульнасаюзнаму стэрэатыпу. Напрыклад, бамаўская інфармацыя, якая падавалася як найважнейшая, ці другая, падобная ёй, выцясняла самыя каштоўныя мясцовыя паведамленні, стварала ў свядомасці журналіста цвёрдую ўпэўненасць малазначнасці і грамадскага абясцэньвання ўсяго таго, што сапраўды складала «гушчу жыцця». Журналісты пісалі і цяпер пішуць безнацыянальна, безадрасна.

Такія матэрыялы роўныя па сэнсу — «без роду і племені». І калі б пад артыкулам калі-нікалі не стаяла Ленінград, Талін, Мінск, Кіеў, Баку, Ташкент, Алма-Ата, то цяжка было б здагадацца, у якім краі адбываецца дзеянне.

Не адпавядае сапраўднасці ў наш час і тэзіс, што журналістыка, друк, радыё і тэлебачанне — гэта элементы культуры. Па форме — так, а па зместу — не.

Сродкі масавай інфармацыі, страціўшы ленінскія прынцыпы функцыяніравання, доўгі час дэкларавалі антысацыялістычныя і антысацыяльныя стэрэатыпы, прапагандавалі маральны кодэкс будаўніка камунізму на фоне амаральных, антыпартыйных паводзін часткі кіруючага партыйнага і адміністратыўнага, гаспадарчага апарату. Выстаўляючы хлусню за ісціну, беззаконне за права, аўтарытарны сацыялізм за развіты, СМІ дэзінфармавалі грамадскую думку, падрывалі асновы агульначалавечай маралі і дружбы савецкіх народаў.

СМІ, такім чынам, прынялі ўдзел у кансервацыі нацыянальных культур. Справа дайшла да таго, што рэдкія спецыяльныя нумары газет, прысвечаныя жыццю саюзнай рэспублікі, станавіліся падзеяй, і толькі цяпер вырашаецца пытанне аб выхадзе нацыянальных рэспублік на ўсесаюзнае радыё і тэлебачанне. У прапагандзе міжнацыянальных адносін мы адсталі роўна настолькі, наколькі багата сацыяльна-канфліктных праблем з'явілася ў нашай краіне ў апошні час, перад якімі, дарэчы, наша журналістыка спачатку разгубілася, а журналісты аказаліся непадрыхтаванымі да іх вывучэння і аб'ектыўнага адлюстравання.

Гэта здарылася часткова таму, што на факультэтах журналістыкі выхоўваюцца спецыялісты «без нацыянальнага зместу», г. зн. без глыбокага разумення мясцовых пытанняў і бачання іх у дыялектычнай сувязі з усесаюзнымі і нават сусветнымі праблемамі. Ніхто не стане адмаўляць, што палітычныя і эканамічныя абставіны ў Польшчы так ці іначай адгукнуцца ў Беларусі і, наадварот, тое ж можна сказаць аб Украіне і іншых рэспубліках.

Нацыянальная самасвядомасць стварае магутны падмурак для развіцця інтэрнацыянальных пачуццяў. Мы аб гэтым чамусьці запамяталі і пагэтаму рыхтуем сваіх студэнтаў дылетантамі, якія, не ўявіўшы сутнасці грамадска-палітычнага і культурнага развіцця сваёй нацыі, не могуць зразу-

мець каштоўнасці гістарычнага шляху і бясцэннасці культурнага развіцця іншых.

У сувязі з гэтым патрэбна хуткая навукова-тэхнічная пераарыентацыя журналісцкай адукацыі ў нацыянальных рэспубліках. Яе аснову павінен скласці нацыянальны змест: філасофія, мова, літаратура і журналістыка.

Сучасныя вучэбныя планы, якія толькі што ўведзены, не дадуць эфекту, таму што адлюстроўваюць канцэпцыю з філалагічным ухілам і гістарычна-храналагічным інфармацыйным метадам навучання. Ад гэтага неабходна рашуча адыйсці і перанесці цэнтр цяжару на функцыянальную, тэарэтычную, філасофскую падрыхтоўку журналіста як палітычнага дзеяча, публіцыста.

Нацыянальным факультэтам журналістыкі патрэбны індывідуальныя праграмы навучання. У іх павінна суразмерна адлюстравацца магчымасць вывучэння спецыфічных прадметаў, сацыяльна-эканамічных асаблівасцей рэспублікі.

У сучасным вучэбным плане, напрыклад, з першага да чацвёртага курса студэнты вывучаюць замежную літаратуру. На гэта адведзена часу значна больш, чым на асноўны прадмет — журналістыку. Разам з тым час, адведзены на вывучэнне беларускай літаратуры, зусім нязначны. У яго межах немагчыма атрымаць дасканалае ўяўленне пра творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, Аркадзя Куляшова, Івана Мележа, Васіля Быкава.

Зразумела, што нельга адмаўляць вялікага ўздзеяння сусветнай класікі на фарміраванне адукаванай асобы, а тым больш журналіста. Аднак жа методыка выкладання літаратуры, экспансіраваная на журфакі з філфакаў, літаральна «з'ядае» час студэнтаў.

Не трэба даказваць, што паглыбленае вывучэнне нацыянальнай гісторыі, грамадска-палітычнай думкі, літаратуры, публіцыстыкі стварае прадумовы для фарміравання асобы журналіста, выхавання нацыянальнай сацыялістычнай свядомасці.

Наспеўшую неабходнасць новага падыходу да падрыхтоўкі кадраў можна праілюстраваць на прыкладзе нашай рэспублікі, хоць з падобнымі праблемамі сутыкаюцца і ў другіх рэспубліках.

Да перабудовы неабгрунтавана план прыёму на факультэт журналістыкі Беларускага універсітэту быў зніжаны да 50 чалавек. Прызыў у армію пасля першага курса забіраў хлопцаў, колькасць студэнтаў змяншалася амаль напалову. У выніку ўжо чацвёрты год факультэт размяркоўвае журналістаў толькі жаночага полу, не задавальняе і адной трэці заявак рэдакцый газет, радыё і тэлебачання. Разам з тым факультэт перапоўнены замежнымі студэнтамі. Калі ў Гарвардскім універсітэце 17 % студэнтаў складаюць «замежнікі», то на нашым факультэце іх амаль 50 %. Гэта спараджае столькі праблем, што яны не акупляюцца ні палітычнымі матывамі, ні тым больш матэрыяльнымі сродкамі.

Вяртанне да праблем адраджэння беларускай мовы і нацыянальнай культуры ў значнай ступені абвастрыла патрабаванні да прафесіянальнай падрыхтоўкі журналістаў і асабліва высокай моўнай падрыхтоўкі. Стварыліся алагічныя супярэчлівасці: у школах нацыянальная мова вывучаецца фармальна, універсітэт жа павінен даць высокую сучасную якасць у авалоданні ёю. Зразумела, што вырашыць гэтую праблему наскокам немагчыма.

Ва ўсякім разе неабходна падрыхтаваць новае пакаленне студэнтаў і выкладчыкаў, якія не толькі ўсвядомяць неабходнасць нацыянальнага зместу адукацыі, але і самі будуць тым нацыянальным асяроддзем, у якім можа выспець беларуская і, зразумела, сацыялістычная асоба журналіста.

У распрацоўку новай канцэпцыі падрыхтоўкі нацыянальных журналісцкіх кадраў павінны ўключыцца творчыя саюзы, партыйныя органы, як гэта робіцца ў некаторых сацыялістычных краінах. Многае тут патрабуе кардынальнага перагляду. На факультэт павінны прыходзіць людзі з рэдакцый, прайшоўшыя там пэўную стажыроўку. Аднак у цяперашні час не ва ўсіх рэдакцыях маюцца нават свае школы юнкораў. Пагэтаму, магчыма, неабходна стварыць аб'яднаныя трохгадовыя школы ў такіх прамысловых гарадах рэспублікі, як Орша, Бабруйск, Мозыр, Пінск, Баранавічы, а пры факультэце адкрыць рэспубліканскую завочную школу юных журналістаў. Гэта дазволіць рыхтаваць устойлівы кантынгент абітурыентаў, каб не абапірацца пры прыёме на выпадак.

Наспеў час пераходзіць на бесперапынную адукацыю журналістаў рэспублікі. Цэнтрам гэтай адукацыі зноў-такі можа стаць факультэт. У 1988 годзе ва універсітэце адкрыта трохгадовае завочнае аддзяленне для журналістаў з вышэйшай адукацыяй. Аднак гэтага далёка недастаткова для Саюза

журналістаў рэспублікі. Патрэбны кароткатэрміновыя аднамесячныя курсы для ўсіх катэгорый раённых газетчыкаў у першую чаргу. Такія цэнтры ўжо адкрыліся і дзейнічаюць у некаторых універсіэтах краіны. Чым больш мы будзем марудзіць з арганізацыяй перападрыхтоўкі. кадраў, тым больш будзе адставаць беларуская журналістыка ад запатрабаванняў часу перабудовы.

Недасканальнае і несправядлівае размеркаванне журналістаў шмат у чым абясцэньвае работу калектыва факультэта. Абмяжоўваецца свабода выбару, між рэдакцыямі і факультэтамі існуе шмат бюракратычных інстанцый. У Мінску застаюцца працаваць толькі мінчане — талент падменьваецца прапіскай. Магчыма, гэтую праблему можна вырашаць, напрыклад, так, як у Балгарыі. Там факультэт журналістыкі не размяркоўвае сваіх выпускнікоў. Толькі праз конкурс яны могуць быць прынятыя на работу ў рэдакцыю.

У нашых умовах заслугоўвае далейшага вывучэння мэтавы метад навучання, накіраванне рэдакцыямі ва універсітэт сваіх будучых работнікаў. Гэта можа ажыццяўляцца шляхам фінансавага дагавору паміж зацікаўленымі бакамі, што зараз атрымлівае ўсё большае распаўсюджванне ў сістэме вышэйшай школы.

Патрэбна пашыраць аспірантуру, адкрыць новыя спецыялізацыі: работнікаў выдавецтваў, фота- і кінасправы, зменшыць прыём на замежнае аддзяленне, перавесці арганізацыйнае, метадычнае і вучэбнае забеспячэнне завочнага на стацыянарны факультэт і г. д.

Я назваў толькі некаторыя праблемы падрыхтоўкі кадраў. У тэзісным выкладанні яны здаюцца простымі. Але гэта далёка не так. Патрэбны сумесныя намаганні зацікаўленых бакоў, матэрыяльная дапамога дырэктыўных органаў. На жаль калектыў выкладчыкаў і студэнтаў факультэта чакае гэтай дапамогі на працягу больш чым дзесяці гадоў. На універсітэцкі бюджэт зрабіць гэта немагчыма.

Не драматызуючы абставіны, звязаныя з журналісцкай адукацыяй, патрэбна заключыць, што калі мы не ліквідуем нашы хібы ў хуткім часе і, у першую чаргу, не выправім матэрыяльную базу, мы спраграміруем адставанне журналістыкі да канца стагоддзя як мінімум у трох вымярэннях: у развіцці журналісцкай навукі, падрыхтоўцы кадраў і развіцці сродкаў масавай інфармацыі.

Адной з галоўных вех на гэтым шляху з'яўляецца аднаўленне нацыянальнай журналістыкі як часткі сапраўды народнай культуры, нацыянальнай публіцыстыкі, як эфектыўнага сродку фарміравання рэвалюцыйнай грамадскай думкі.